книгу «Память. Гродненский район». Время неумолимо. Редеют ряды ветеранов-победителей. Очень важно успеть записать их воспоминания, сделать фотографии, обновить экспозиции школьных музеев и комнат боевой славы. Здесь большое поле деятельности для молодежных и пионерских организаций района, учителей, работников культуры. Пятьдесят лет я посвятил исследованию партийно-комсомольского подполья, партизанского движения на Гродненщине в годы Великой Отечественной войны. Написал документальные повести «В борьбе закаленные» (о деятельности Белостокского антифашистского комитета ), «Лида» (вышло два издания ). Отдельная глава посвящена партизанам и подпольщикам. В книге «В годы суровых испытаний» рассказываю о совместных действиях Волковысского антифашистского комитета, Белостокского подпольного обкома ЛКСМБ и партизанского отряда им. М.И.Калинина. В 1975 году издательство «Беларусь» тиражом 50000 экземпляров издало сборник воспоминаний партизан и подпольщиков Гродненщины «В принеманских лесах».

В настоящее время завершается работа над книгой «Память. Белорусский пограничный округ». В ней будут опубликованы документы, воспоминания, статьи, списки погибших и пропавших без вести пограничников по каждому из одиннадцати пограничных отрядов.

УДК 94 (476) |451|

## САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ МЯСТЭЧАК ГРОДЗЕНСКАГА ПАВЕТА Ў 1921 – 1939 ГГ.

**Г.С. Вайцешчык**
УА “Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы ”
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Артыкул прысвечаны тым складаным працэсам і з’явам, якія адбываліся ў сацыяльна-эканамічным жыцці мястэчак Гродзенскага павета ў 1921 - 1939 гг. На прыкладзе развіцця мястэчак Гродзенскага павета можна прасачыць, якой непаслядоўнай і каланіяльнай была пазіцыя Польскага ўрада ў гэты час. У аснову артыкула пакладзены архіўныя матэрыялы.

This article is devoted difficult processes which occurred in a social and economic life in the small towns of Grodno district during the period of 1921 – 1939. On an example of small towns of Grodno district can be tracked was what inconsistent and colonial position of the Polish government. The article is based on the archival documents.

У апошні час у сучаснай гістарычнай навуцы ўсё больш уздымаецца праблемных і дыскусійных пытанняў. Адно з іх звязана з сацыяльна-эканамічным становішчам Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы. Згодна з агульнапрынятай у айчыннай і замежнай гістарыяграфіі пазіцыяй Заходняя Беларусь была аграрна-сыравінным



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

прыдаткам Польшчы, а заходнебеларускія мястэчкі былі адсталымі ў сацыяльна-эканамічным плане. Аднак некаторыя даследчыкі лічаць, што эканамічная палітыка Польшчы адносна "ўсходніх крэсаў" была не каланіяльнай, а палітыкай уніфікацыі, г.зн. прыстасаванай да ўмоў гаспадарчага развіцця Польшчы. Даць аб'ектыўную ацэнку з'явам і працэсам такога складанага перыяду ў жыцці беларускага народа можна толькі зыходзячы з канкрэтных фактаў.

Колькасць мястэчак у значнай ступені перавышала колькасць гарадоў Заходняй Беларусі з-за нешматлікасці апошніх, іх эканамічныя функцыі бралі на сябе мястэчкі. На прыкладзе Гродзенскага павета паспрабуем прасачыць сацыяльна-эканамічнае становішча, ў якім апынуліся такі тып пасяленняў, як мястэчкі, якія ўвабралі як гарадскія, так і вясковыя рысы развіцця.

Гродзенскі павет у 1921 г. з цэнтрам у г. Гродна, плошчай 4743 км$^2$ дзяліўся на 21 гміну і ўключаў у свой састаў 1 горад (Гродна) і 7 мястэчак (Азёры, В.Бераставіца, Індура, Крынкі, Масты, Друскеннікі, Скідзель) і ўваходзіў у склад Беластоцкага ваяводства [18, с.126-127].

Мястэчкі Гродзенскага павета былі невялікімі як па сваім памерам, так і па колькасці пражываемага ў іх насельніцтва (ад 2000 да 4000 чалавек), пераважна яўрэйскага. Так, у мястэчку Скідзель, па дадзеных перапісу 1921 г., налічвалася 388 будынкаў і 2908 жыхароў (1371 мужчына і 1539 жанчын). Паводле нацыянальнай прыналежнасці – яўрэяў налічвалася 1996 асобаў, палякаў – 504 чалавека, беларусаў – 359, расіян – 35, татараў – 11, літоўцаў – 1, русінаў (так у міжваеннай Польшчы афіцыйна называлі ўкраінцаў) – 1 [17, с.30].

Прамысловая вытворчасць у павеце развівалася вельмі марудна і была прадстаўлена толькі тэкстыльнай, дрэваапрацоўчай і харчовай галінамі. Прамысловыя прадпрыемствы былі пераважна дробнымі, у некаторых мястэчках іх увогуле не было. У Азёрах да 1929 г. дзейнічала суконная фабрыка і 2 лесазаводы па пачатковай апрацоўцы драўніны [12, с.175]. У Скідзелі ў 1925 г. меліся 3 невялікія гарбарныя заводы, у наступныя гады іх колькасць павялічылася да 5 [16, с.75]. У В.Бераставіцы сезонна працаваў спіртзавод, які належаў мясцоваму памешчыку, некалькі смалакурань, млыноў, пякарань [15, с.122]. У такіх мястэчках, як Індура і Крынкі, вялікае месца займала рамесная вытворчасць. Найбольш распаўсюджанымі відамі рамяства з'яўляліся: кравецкае, сталярскае, кузнецкае, рымарскае. Шэраг абмежаванняў з боку польскіх улад, адносна развіцця рамяства і гандлю, значна звужалі эканамічныя магчымасці месьачкоўцаў. Згодна з артыкулам № 45 "Prawa Przemysłowego" на трыманне тартаркаў, млыноў, кузьні, пілярам неабходна было спецыяльнае распараджэнне ад мясцовых улад

[16, л.47].

Найбольш буйным прадпрыемствам не толькі ў Гродзенскім павеце, але і ва ўсёй Заходняй Беларусі была фанерная фабрыка ў мястэчку Масты, якая была пабудавана ў 1927 г. невыпадкова, таму што адзінай галіной прамысловасці ў Заходняй Беларусі, якая набыла значнае развіццё, была дрэваапрацоўчая, вырабы якой ішлі пераважна на экспарт. У 1935 г. на фабрыцы працавала 370 рабочых і выраблялася 7 тысяч кубаметраў фанеры штогод [14, л.1]. Вытворчасць фанеры ў Заходняй Беларусі складала каля 70% агульнапольскага экспарту ў 1930-я. гг. Гэта вяло да празмернай эксплуатацыі лясных багаццяў польскімі і замежнымі манаполіямі. У 1919 – 1939 гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі было высечана 586, 2 тыс. га. лясоў. Натуральны прырост лясных угоддзяў склаў толькі 41, 8 тыс. га. [13, с.167]. Па некалькі лесапілак было ў кожным мястэчку Гродзенскага павета.

Амаль ва ўсіх мястэчках Гроденскага павета па два разы на тыдзень адбываліся таргі. Асноўным базарным днём былі аўторак і нядзеля. Па аднаму разу на тыдзень збіраліся таргі ў мястэчках Скідзель і Азёры [18, л.318]. У мястэчку Індура таргі праходзілі ў сераду і пятніцу [18, л.318]. Гандлявалі, у асноўным, прамысловымі таварамі, жывёлай, сельскагаспадарчымі прадуктамі і прыладамі працы.

Сацыяльнае заканадаўства аб 8-гадзінным рабочым дні, бальнічных касах, платных водпусках, ахове дзяцінства ў мястэчках Гродзенскага павета амаль не прымянялася. Рабочы дзень на фанернай фабрыцы ў Мастах доўжыўся да 10 – 12 гадзін у змену пры аплаце 2,2 – 2,5 злотага за дзень. Жанчыны атрымоўвалі за такіж аб’ём працы 1,6 – 1,7 злотых. Яшчэ ніжэй ацэньвалася праца падлеткаў [14, с.27].

Штрафы яшчэ больш памяншалі заробкі. Пры сярэднянядзельным заробку 15 – 18 злотых за малейшае парушэнне ўстаноўленных на прадпрыемстве парадкаў (за невыкананне норм, за непавагу да начальства, а часцей і без усялякай прычыны) прадпрыемствы штрафавалі працоўных на 5 – 10 злотых. Больш 1/3 заробку “праглынала” кватэрная плата. А жыллёвыя ўмовы жадалі чакаць лепшага. З 1921 – 1939 гг. польскімі і мясцовымі ўладамі былі пабудаваны ў Мастах толькі чатыры аднапакаёвыя кватэры ў асноўным для мясцовай адміністрацыі [14, с.27]. Асноўная маса рабочых мястэчка жыла ў бараках, дзе ў адным пакоі пражывала па некалькі сямей.

Медыцынскае абслугоўванне местачковага насельніцтва было недастатковым. Да 1932 г. існавала толькі адна раённая бальніца ў Скідзелі на 30 ложкаў, тэрмін лячэння ў якой складаў 6 і 10 дзён [16,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

с.75]. У В.Бераставіцы быў таксама адзін урач – М.Касакоўскі, які займаўся прыватнай практыкай. Лячэнне ў бальніцах для большасці насельніцтва было недаступным, што стала прычынай рэзкага павелічэння колькасці інфекцыйных захворванняў (туберкулёзу, ганарэі, сыпнога тыфу). У 1932 г., паводле справаздачы беластоцкага ваяводы, ў Гродзенскім павеце быў зарэгістраваны самы вялікі паказчык у ваяводстве захворванняў на сухоты – 932 выпадка [1, с.24].

Каля 90% местачковага насельніцтва было занята ў сельскай гаспадарцы. Аграрныя адносіны ў Гродзенскім павеце характарызаваліся панаваннем буйнога памешчыцкага землеўладання, малазямеллем і паўперызацыяй (масавым збядненнем) большай часткі сялян. Вялікая колькасць местачковых сялянскіх гаспадарак мела 3 – 4 га зямлі, а на долю памешчыка (на прыкладзе м. В.Бераставіца) прыходзілася каля 330 дзесяціны (дзесяціна = 1,2 га.) [19, с.3]. А для забеспячэння сярэдняга жыццёвага ўзроўню неабходна было 5 – 6 га. пры 4 – 5 членаў сям'і. Таму палавіна сялянскіх гаспадарак былі беззямельнымі і малазямельнымі. Сялян абкладвалі вялікімі падаткамі, а іх існавала каля 80, у тым ліку царкоўны, гмінны, маставы, канцылярскі і інш. Вельмі шырока рымяняліся штрафы. У мястэчку Азёры штрафавалі за парушэнне правіл лоўлі рыбы [11, л.23], у В.Бераставіцы штрафавалі за тое, што селянін садзіў у агародзе тытунь, ці выкарыстоўваў запальніцу і крэмень, таму што існавала запалкавая і тытунёвая манаполія. За 1934 г. на тэрыторыі Гродзенскага павета мясцовай камендатурай было складзена 4423 карных пратакола за нелегальнае вырошчванне, продаж і захоўванне тытуню і было канфіскавана 355 кг 838 г. тытуню [5, л.6]. Урад нават выдаў спецыяльны ўказ, у якім было прадпісана, што агонь дазваляецца дабываць толькі з дапамогай запалак, карыстацца тытунем толькі фабрычнай вытворчасці [3, л.42]. Сюды належыць дабавіць абавязковыя ўзносы па страхаванню хаты: маёмасці ад пажару, прымусовыя пазыкі, пені і розныя дробныя ўплаты. У выніку атрымлівалася, што агульная сума ўсіх падаткаў і штрафаў з местачковай сялянскай гаспадаркі раўнялася 30 – 50% валавой выручкі селяніна. Каб спагнаць нядоімкі, мясцовыя ўлады шырока выкарыстоўвалі сродкі прымусу. Нярэдка практыкаваліся так званыя экзэкуцыі і ліцытацыі (распрадажа маёмасці даўжнікоў на публічных таргах). Паводле распараджэння акруговага суда ў мястэчку Індура 18 лютага 1930 г. у 10 гадзін раніцы на местачковым рынку адбылася публічная ліцытацыя гаспадаркі П. Зелмановіча. Даход ад ліцытацыі склаў 400 злотых [9, л.68].

Эканамічны крызіс 1929 – 1933 гг., панаванне манаполій і буйнога памешчыцкага землеўладання, узмацненне ўціску працоўных, рэакцыйная зямельная і падатковая палітыка ўрада прыводзілі да значнай міграцыі



РЕПОЗИТОРИЙ ГрГУ

местачковага насельніцтва ў краіны ЗША і на Усход. У 1930 г. з мястэчка Індура 14 сямей выехалі ў Аргентыну [9, л.189, 193зв, 196, 242, 246, 247, 249]. У 1933 г. 9 сямей з Мастоў [17, л.45] і 7 сямей са Скідзеля мігрыравалі ў Канаду і Мексіку [12, л.6]. Аднак, большасці местачкоўцам была адмоўлена ў атрыманні візы на выезд за мяжу, што сведчыла аб тым, што мясцовыя ўлады значна абмяжоўвалі міграцыйныя працэсы.

Такім чынам, можна прыйсці да высновы, што сацыяльна-эканамічнае развіццё мястэчак Гродзенскага павета ў 1921 – 1939 гг. было дастаткова складаным, таму што ўрад Польскай дзяржавы праводзіў каланіяльную палітыку стрымлівання развіцця вытворчых сіл Заходняй Беларусі, пераўтвараючы гарады і мястэчкі “усходніх крэсаў” у асноўную крыніцу сыравіны для прамысловасці цэнтральных і заходніх ваяводстваў Польшчы.

Літаратура


1. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Фонд 2130. – Воп. 1. – Спр. 33: Sprawozdanie wojewody Bialostockiego 1934.
2. ДАГВ – Фонд 24. – Воп. 1. – Спр. 98
3. ДАГВ – Фонд 27. – Воп. 1. – Спр. 12
4. ДАГВ – Фонд 29. – Воп. 1. – Спр. 121
5. ДАГВ – Фонд 29. – Воп. 1. – Спр. 132
6. ДАГВ – Фонд 29. – Воп. 1. – Спр. 51
7. ДАГВ – Фонд 29. – Воп. 1. – Спр. 51
8. ДАГВ – Фонд 29. – Воп. 1. – Спр. 9
9. ДАГВ – Фонд 36. – Воп. 1. – Спр. 47
10. ДАГВ – Фонд 36. – Воп. 1. – Спр. 47
11. ДАГВ – Фонд 39. – Воп. 1. – Спр. 115
12. Князева, В.І. Падарожжа па Беларусі: Гарады і гарадскія пасёлкі / В.І. Князева. – Мінск: Беларусь, 2005. – 303 с.
13. Ладысеў, У.Ф. Заходняя Беларусь ў 1921 – 1939 гг. / У.Ф. Ладысеў // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / А.П. Вайтовіч, А.М. Данілаў і інш. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2000. – с. 166 – 180
14. Мараш, Я.Н. Мосты: Ист.-экон. очерк / Я.Н. Мараш, И.И. Ковкель, А.С. Себастьян. – Минск: Беларусь, 1986. – 111 с.
15. Памяць: Гіст. – дакум. хроніка Бераставіцкага р-на. – Мінск: БЕЛТА, 1999. – 624 с.
16. Памяць: Гіст. – дакум. хроніка Гродзенскага р-на. – Мінск: БелЭн, 1993. – 431 с.
17. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wynikow pierwzego powszehnego spisu ludności z dn. wreśnia 1921 r. i innych żrodel urzędowych. T. 5. Wojewodstwo Białostockie. – Warszawa, 1924.
18. Смоліч, А. Матэрыялы для геаграфіі і статыстыкі Беларусі. Т.1: Крыніцы ведаў аб нацыянальнам складзе насельніцтва Заходняй Беларусі / А. Смоліч. – Мінск, 1928. – 216 с.
19. Хонцар, У. Бераставіччына ў 1921 – 1939 гг. / У. Хонцар // Бераст. Газета. – 1993. – 19 чэрвеня – С.3.




РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ